Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

5. *Антонов Д.Н. Антонова И.А.* Метрические книги России XVIII – начала XX в. М., 2006. 385 с.

6. Параф'янава – аграгарадок Параф'янаўскага с/с Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. РБ ; ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 1056, 1058, 1060, 1062, 1101, 1102. Метрычныя кнігі Параф'янаўскага касцёла аб хросце за 1800–1827, 1840–1849 гг., шлюбе за 1835–1841 і смерці за 1838–1848, 1915 гг., рэестры венчаных за 1916–1924 гг.

7. Дунілавічы – аграгарадок Дунілавіцкага с/с Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. РБ ; ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 1045. Метрычная кніга Дунілавіцкай грэка-каталіцкай царквы аб хросце за 1814–1822 гг.

8. Удзела – аграгарадок Удзелаўскага с/с Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. РБ ; ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 947. Метрычная кніга Удзелаўскага касцёла аб смерці за 1772–1800 гг.

9. Ажуны – вёска Варапаеўскага с/с Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. РБ ; ЦНБ імя Якуба Коласа. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 1131. Метрычная кніга Ажунскага касцёла аб хросце за 1799–1809 гг.

10. Ружаны – гарадскі пасёлак Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. РБ ; ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 1128. Метрычная кніга Ружанскай грэка-каталіцкай царквы аб хросце і шлюбе за 1748–1761 гг.

11. Пінск – горад, цэнтр Пінскага р-на Брэсцкай вобл. РБ ; ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 1130. Метрычная кніга Пінскага касцёла аб хросце і шлюбе за 1799–1829 гг.

12. Вольна – вёска Вольненскага с/с Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. РБ ; ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 1169–1170. Метрычныя кнігі Вольненскай грэка-каталіцкай царквы аб хросце за 1791–1809, 1821–1826 гг.

13. Чэрск – вёска Дамачаўскага с/с Брэсцкага р-на Брэсцкай вобл. РБ ; ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 2. Спр. 1185. Метрычная кніга Чэрскай праваслаўнай царквы аб хросце за 1760–1777 гг.

*К.В. Сыцько*

## Склад бібліятэкі Валкалацкай парафіі ў XVIII–XX стст. (паводле матэрыялаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі і парафіяльнага архіва)

У артыкуле апісаны лёс бібліятэкі парафіі Святога Яна Хрысціцеля ў Валкалаце. Рэканструіруецца яе склад, прыводзяцца звесткі аб папаўненні колькасці кніг у бібліятэцы ў XVIII–XX стст., яе статусе ў сістэме парафіі, а таксама захаванасці на сённяшні дзень.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

*Ключавыя словы:* бібліятэка, парафія, інвентар, візітацыя, рэлігійная літаратура.

*К.В. Сытько*

**Состав библиотеки Валкалатского прихода в XVIII–XX вв. (по материалам Центральной научной библиотеки НАН Беларуси и приходского архива)**

В статье описывается судьба библиотеки прихода св. Иоанна Крестителя в Валкалате. Реконструируется ее состав, приводятся сведения о количестве книг в библиотеке в XVIII–XX веках, ее статусе в приходской системе, а также сохранности до настоящего времени.
*Ключевые слова:* библиотека, приход, инвентарь, посещение, религиозная литература.

*K. Sytsko*

**The composition of the library of Valkalata parish in the XVIII–XX centuries (according to the materials from the Central Scientific Library of NAS of Belarus and the parish archive)**

The article describes the fate of the library of the parish of St. John the Baptist in Valkalata. Its composition is reconstructed, the information on the number of books in the library in the XVIII–XX centuries, its status in the parish system, as well as its preservation to date is given.
*Keywords:* library, parish, inventory, visitation, religious literature.

Праблема парафіяльных бібліятэк дастаткова рэдка ўздымаецца ў айчыннай гуманітарыстыцы. Куды часцей гісторыкі і бібліятэказнаўцы даследуюць пытанні, звязаныя з добраўпарадкаванымі і адносна буйнымі па памерах кніжнымі зборамі кляштараў, капітулаў, семінарый, якія ўяўляюць куды

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

больш значны інтарэс у кантэксце гісторыка-культурнай каштоўнасці. Парафіяльныя ж бібліятэкі, нярэдка дрэнна арганізаваныя і дробныя па памерах, звычайна з’яўляюцца каштоўнымі выключна ў лакальным вымярэнні. У дадзеным артыкуле разглядаецца склад бібліятэкі парафіі ў Валкалаце, асаблівасцю якой з’яўляецца тое, што некаторая частка кніг, апісаных у інвентарах XIX ст., на сённяшні дзень захоўваецца ў трох куфрах у мясцовым касцёле.

Дакладная дата стварэння парафіі Святога Яна Хрысціцеля ў Валкалаце невядома. Першыя згадкі ўжо пабудаванай і кансекраванай драўлянай святыні датуюцца 1522 г., калі біскуп Ян Охстат правёў першую генеральную візітацыю тэрыторыі Віленскага біскупства [1]. Натуральна, пачаткі мясцовай парафіяльнай бібліятэкі, як сукупнасці кніг, з дапамогай якіх пробашчам правадзілася душпастырства, трэба бачыць менавіта ў гэтых датах.

Асаблівасцю бібліятэкі парафіі Св. Яна Хрысціцеля з’яўляецца тое, што яна дакладна размяжоўвалася з г. зв. «царкоўнымі кнігамі», хаця ў іншых парафіяльных адзінках на тэрыторыі Беларусі такога не заўважана *(гл., напр.:* [2]). Як вынікае з аналізу комплексу інвентароў і візітаў, пад бібліятэкай у XVIII–XX стст. валкалацкія пробашчы разумелі комплекс кніг літургічнага і свецкага характару «…старинных разного содержания и на разных языках в переплете, а по большей части без начала…» [3], якія не выкарыстоўваліся ў касцельных службах і знаходзіліся на захаванні разам з архівам на гарышчы касцёла. Пад «царкоўнымі кнігамі» разумелі адзінкі, якія захоўваліся ў закрыстыі і адпавядалі дзеючым кананічным нормам і правілам. Іх колькасць была невялікай, звычайна каля 10–15 асобнікаў. Гэта свяцільныя і жалобныя служэбнікі, трэбнікі, евангелікі, антыфанарыі [4].

Як і ў выпадку з іншымі рымска-каталіцкімі парафіямі, асноўнай крыніцай ведаў аб складзе і стане бібліятэкі Валкалацкага касцёла з’яўляюцца акты візітацый і перадатачныя інвентары, якія захаваліся як у мясцовай святыні, так і ў фондзе 23 аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

бібліятэкі НАН Беларусі, куды былі перададзены М.Я. Грынблатам па выніках яго экспедыцый [5].

Агульнай заканамернасцю дадзеных апісанняў бібліятэк з'яўляецца выключная недакладнасць запісаў. Так, часцей за ўсё візітатар ці перапісчык касцельнай маёмасці не меў дастатковую колькасць часу, каб унікнуць у сутнасць і вызначыць дакладную назву кнігі, вокладка якой была пашкоджана ці адсутнічала, і перапісваў усё па знешніх прыкметах. З гэтай прычыны ў шмат якіх апісаннях адсутнічаюць даты выдання, імёны аўтараў, ці нават назвы кніг [6]. Напрыклад, у інвентарным вопісе за 1841 г. нярэдка сустракаюцца пазіцыі накшталт: «Thomas a Cempis w skurze starey z futeralikiem» *(хучэй за ўсё, на ўвазе меўся трактат "De Imitatione Christi" (Аб падражанні Хрысту),* «Kazania Swiąteczne bez paczątku niewiadomego autora nie oprawione sztuka iedna» [7].

Інвентары святаянаўскай парафіі сведчаць, што бібліятэка папаўнялася павольна і да 1818 г. налічвала толькі 10 адзінак «старых» кніг [8]. Прычынай гэтага была асаблівасць кіравання парафіяй. Так, калі ў кляштарах і капітулах для папаўнення, упарадкавання і захавання бібліятэкі і архіва выдзяляўся адмысловы святар *(кусташ)* [9], то ў парафіяльных касцёлах увесь цяжар працы па ўсіх пытаннях ускладаўся на пробашча, а ў выпадку, калі парафія мела больш за 1 500 вернікаў рымска-каталіцкага вызнання – на вікарыя.

У Валкалацкай парафіі вікарыя не было, таму яе папаўненне пачалося толькі ў канцы 1820 – пачатку 1830 гг. пры кс. Базыле Юзафе Генько, які быў зацікаўлены ў набыцці друкаванай прадукцыі не толькі духоўнага, але і свецкага зместу. Акрамя таго, кс. Базыль, як сведчаць гістарычныя крыніцы, далучыў да касцельнай бібліятэкі некаторыя кнігі з прыватнага кнігазбору. Найбольш старой кнігай са збору кс. Б.Ю. Генько, якая захавалася да нашых дзён у валкалацкім касцёле, з'яўляецца «Brevi Compendio Doctrinam Fidei Ac Morum» *(Кампендыўм дактрыны веры і маралі)*, выдадзены ў Торуні ў 1592 г. Не менш каштоўным захаваным асобнікам з гэтай жа калекцыі з'яўляецца кніга Дж. Барклая «Argensis Cum Glave» *(Аргеніды)*, надрукаваная ў 1659 г. у тыпаграфіі Каспара

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Фрэйшмідта ў Вене. Абодва выданні пазбаўлены вокладкі, але ў іх прысутнічаюць авантытулы і поўны набор старонак, кніжны блок не дэфармаваны, негледзячы на ўмовы захавання.

У 1831 г. бібліятэка парафіі ў Валкалаце налічвала ўжо 18 тамоў [10], у 1830–1839 гг. колькасць кніг складала 58 асобнікаў [11]. Паводле падаўчага інвентару 1841 г., пры кс. Мартыне Севярыне Аўгусціновічы бібліятэка налічвала ўжо 105 тамоў кніг і ўключала ў тым ліку 58, што засталіся ў спадчыну пасля памерлага кс. Б.Ю. Генько [12]. Большая частка кніг – лацінамоўныя гаміліі, прысутнічалі брэвіярыі, кампендыўмы каталіцкай веры, трактаты па тэалогіі *(пераважна пастаральнай, але о спісах можна знайсці творы па тэалогіі аскетычнай і маральнай)*, градуалы, медытацыі, катэхізісы, экзорты, эпістолы, а таксама кнігі, прысвечаныя гісторыі хрысціянства, агіяграфічная літаратура і г. д. Сярод найбольш цікавых асобнікаў можна вылучыць евангелічныя трактаты Гераніма дэ Ламаза, казанні Матэўша Стэмплеўскага, трактат «Аб пагардзе да двара і ўхваленні сялянскага жыцця» Антонія дэ Гевары, «Аб падражанні Хрысту» Тамаша Кемпійскага, «Казанні на нядзелі…» Пятра Скаргі, пратаколы і рашэнні Трыдэнцкага сабора. З кніг свецкага характару (*якія займалі каля 7% парафіяльнай бібліятэкі ў Валкалаце*) вылучаюцца ўжо названыя вышэй «Аргеніды» Барклая, «Prodigium virtutis heroicae Alexander Magnus» *(Цудоўныя гераічныя ўчынкі Аляксандра Вялікага)* Яна Дамаскіна Калінскага, таксама «Фабулы» неназванага іудаісцкага філосафа.

Паводле інвентарных і візітацыйных запісаў, бібліятэка ў такім стане знаходзілася прыблізна да пачатку 1920 гг. У сярэдзіне 1920 гг. пробашчы перасталі ўлічваць складзеныя ў куфры кнігі як бібліятэку і наўпрост адзначалі ў апісаннях «…бібліятэкі няма…» [13]. Пры гэтым на сённяшні момант калекцыі кніг, у тым ліку ксяндзоў, таго перыяду, захоўваюцца ў касцёле. Так, кнігазбор пробашча ў 1937–1942 гг. Рамуальда Дроніча, закатаванага ў 1942 г. у лагеры смерці ў Беразвеччы, папоўніў склад куфраў на касцельным гарышчы. Такую выснову можна зрабіць па наяўнасці ў шэрагу адзінак уладальніцкіх надпісаў кс. Рамуальда, а таксама дароўных запісаў. Напрыклад,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

у адным з захаваных на сённяшні дзень брэвіарыяў 1797 г. выдання, на форзацы захаваўся запіс аб тым, што кніга падорана Дронічу касцельным камітэтам парафіі Жодзішкі перад яго пераездам з Жодзішак у Валкалату ў 1937 г. [14].

Такім чынам, бібліятэка парафіі Святога Яна Хрысціцеля ў Валкалаце ўяўляла з сябе неўпарадкаваную сукупнасць кніг, якія не выкарыстоўваліся ў бягучых пастаральных справах мясцовымі пробашчамі. Яе склад, невялікі па памерах, пачаў папаўняцца толькі ў сярэдзіне XIX ст. і па стане на 1841 г. складаў 105 адзінак. На сённяшні момант некаторая частка парафіяльнага кнігазбору знаходзіцца на захаванні на касцельным гарышчы ў трох вялікіх драўляных куфрах, што гаворыць аб неабходнасці даследавання захаваных адзінак.

1. Biskupstwo Wileńskie od jego założenia aż do dni obecnych, zawierające dzieje i prace biskupów i duchowieństwa djecezji wileńskiej, oraz wykaz kościołów, klasztorów, szkół i zakładów dobroczynnych i społecznych / oprac. ks. bkp. Jan Kurczewski, 1912 r. S. 177.

2. *Булаты П.Ю.* Дзейнасць навучальнай установы пры каталіцкай парафіі Святога Крыжа ў Ляхавічах (XVII – першая палова XIX ст.) // Вышэйшая школа. 2021. № 1. С. 55–57.

3. Архіў парафіі Святога Яна Хрысціцеля ў аг. Валкалата. Б/ф. Б/Воп. Адз. зах. Визита Волколацкого приходского римско-католического костёла, составленная по Указу Виленской римско-католической духовной консистории от 30 апреля 1888 года за № 2747. Арк. 11.

4. Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей – ЦНБ НАН Беларусі). Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. Ф. 23. Воп. 1. Адз. зах. 1042. Арк. 10 адв.

5. Там жа. Адз. зах. 1039, 1040.

6. *Mazur H.* Biblioteki parafialne w dekanacie Książ Wielki w drugiej połowie XVIII wieku. Połrocznik ABMK. 2007. № 88. S. 113.

7. ЦНБ НАН Беларусі. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. Ф. 23. Воп. 1. Адз. зах. 1040. Арк. 8 адв.–9.

8. Архіў парафіі Святога Яна Хрысціцеля ў аг. Валкалата. Б/ф. Б/Воп. Адз. зах. Akt Wizyty Generalney Wołkołackiego Rzymsko Katolickiego parafjalnego Kościoła, plebanji, folwarku i wiosek itp. ... od imia delegowanego wizytatora podpisanego Roku 1818. Арк. 2 адв.

9. *Антановіч З.В.* Архіў і бібліятэка пінскага францысканскага кляштара ў XIX ст. як частка сацыякультурнай спадчыны Піншчыны // Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX–XXI ст. у Беларусі : зб. навук. арт., прысвеч. 100-годдзю з дня нараджэння М.М. Улашчыка / БДУ ; рэдкал.: С.М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2007. С. 192.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

10. ЦНБ НАН Беларусі. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. Ф. 23. Воп. 1. Адз. зах. 1039. Арк. 11.

11. Архіў парафіі Святога Яна Хрысціцеля ў аг. Валкалата. Б/ф. Б/Воп. Адз. зах. Stan Kościoła Parafjalnego Rzymsko Katolickiego Wołkołackiego w Dyecezji Mińskiey w Powiecie Wilejskim położonego i funduczow do jego należączych dnia 16 miesiąca Pazdziernika 1839 Roku Opisany. Арк. 11–11 адв.

12. ЦНБ НАН Беларусі. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. Ф. 23. Воп. 1. Адз. зах. 1042. Арк. 8 адв.–11.

13. Архіў парафіі Святога Яна Хрысціцеля ў аг. Валкалата. Б/ф. Б/Воп. Адз. зах. Visitatio Pastoralis anno 1927 Parochia Wolkolata. Арк. 5.

14. Там жа. Адз. зах. Collectio Brevium at que instructionum, Apostolica, 1797. С. 248.

*Ф.Д. Подберёзкин*

## Палеотипы латинского шрифта из фонда Центральной научной библиотеки Национальной академии наук Беларуси: книги «незамкнутого круга»

В статье рассматривается концепция будущего каталога палеотипов латинского шрифта из фонда ЦНБ НАН Беларуси. Представлен примерный анализ одного из 19 палеотипов – творение Мартина Лютера «In epistolam S. Pauli an Galatas Commentarius…» (Wittneberg, 1535). Автору удалось выявить частичный круг чтения, в контексте которого читатели обращались к экземпляру комментария: это работы Давида Хитреуса, Иоганна Арндта, античные отцы Церкви. Автор считает, что реконструкция круга чтения «Комментария» Лютера должна быть представлена в будущем каталоге, в том числе на примере других палеотипов.

*Ключевые слова:* палеотипы, каталог, Лютер, Хитреус, Арндт, античные отцы, круг чтения.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by